# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 6 мая 1999 года, чацвер, № 9 (1801)


ВІНШУЕМ!

## Лепшыя студэнты-навукоўцы — у БДУ

У 1998 годзе Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь быў праведзены традыцыйны конкурс студэнцкіх навуковых прац па гуманітарных, сацыяльна-эканамічных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках.

Рэспубліканскі конкурс навуковых прац праводзіцца ў кастрычніку-лістападзе кожны год з мэтай актывізацыі навуковай работы студэнтаў, якая з'яўляецца адным з эфектыўных сродкаў павышэння якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Студэнты нашага універсітэта таксама прымалі ў ім удзел.

На конкурс прадстаўляюцца завершаныя навукова-даследчыя працы, якія ўяўляюць сабой самастойна выкананыя даследаванні і распрацоўкі па актуальных праблемах гуманітарных, сацыяльна-эканамічных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук.

У Белдзяржуніверсітэце на конкурс адбіраюцца лепшыя навуковыя работы студэнтаў па выніках традыцыйнай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў, якая штогод праводзіцца ў канцы красавіка альбо пачатку мая.

Кожны год студэнтамі універсітэта на конкурс прадстаўляецца больш за 100 навуковых работ. У 1998 годзе іх было 109. Найбольш студэнцкіх навуковых прац прадставіў на конкурс хімічны факультэт — 16. Найменш — механіка-матэматычны (усяго 1). Філасофска-эканамічны — 15, гістарычны факультэт — 11, факультэт радыёфізікі і электронікі — 10, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 9, юрыдычны — 9, фізічны і факультэт журналістыкі — па 7, філалагічны, біялагічны і геаграфічны — па 6.

68 навуковых прац былі адзначаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь I (13), II (23) і III ступені, а іх аўтарам нададзена званне "Лаўрэат конкурсу навуковых работ студэнтаў Беларусі 1998 года" з уручэннем грашовых прэмій.

Рэктарат, упраўленне падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі і навукі віншуюць лаўрэатаў конкурсу і жадаюць ім далейшых творчых поспехаў.

*К. М. КАРОСЦІК,*
*У. І. МІКУЛОВІЧ*

СВЯТЫ

## Для тых, хто набліжаў гэты дзень

7 мая ў 11 гадзін раніцы ў 206 пакоі галоўнага корпуса БДУ пачнецца ўрачыстае ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з нагоды блізкага свята — Дня Перамогі.

Зразумела, у адрас пераможцаў будзе гучаць шмат цёплых слоў. Але акрамя гэтага плануецца падтрымаць іх і матэрыяльна. Так, па словах старшыні прафкома супрацоўнікаў БДУ Яўгена Пятровіча Туромшы, усе ветэраны Вялікай Айчыннай вайны нашага універсітэта атрымаюць грашовыя прэміі.

У праграме свята — ускладанне кветак да памятнай стэлы, размешчанай у дворыку універсітэцкага гарадка. Дырэкцыяй па справах культуры рыхтуецца літаратурна-мастацкая кампазіцыя, плануецца выступленне фальклорнага гурта "Тутэйшая шляхта". Далей свята будзе працягвацца на факультэтах і ў падраздзяленнях БДУ.

*Кацярына САЛАДУХА*



АКЦЫЯ

## Дапаможам састарэлым

Камітэт БПСМ факультэта радыёфізікі і электронікі Белдзяржуніверсітэта пры ўзаемадзеянні з аддзелам сацыяльнай абароны адміністрацыі Маскоўскага раёна праводзіць акцыю "Міласэрнасць", прымеркаваную да Года састарэлых людзей. Мэтай акцыі з'яўляецца аказанне дапамогі ветэранам і адзінокім састарэлым людзям.

Як адзначыў сакратар камітэта БПСМ ФРФіЭ Андрэй Міхнюк, "маладое пакаленне заўсёды дапамагала старэйшаму, клапацілася аб ім і паважала. І не такі ўжо далёкі той час, калі і самі студэнты пасталеюць. Так што чакаем усіх, хто жадае падтрымаць акцыю "Міласэрнасць", у камітэце БПСМ Белдзяржуніверсітэта ў пакоі 205 галоўнага навучальнага корпуса".

*Прэс-цэнтр маладзёжных арганізацый Белдзяржуніверсітэта*

АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** фізічнай оптыкі, матэматычнага мадэліравання і аналізу даных, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, міжнароднага турызму;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** педагогікі і праблем развіцця адукацыі, матэматычнай фізікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** ядзернай фізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, фізікі, сістэмнага аналізу, матэматычнага мадэліравання і аналізу даных, матэматычнага забеспячэння АСК, тэхналогіі праграміравання, дыферэнцыяльных ураўненняў, лікавых метадаў і праграміравання, ураўненняў матэматычнай фізікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, сучаснай беларускай мовы, гісторыі беларускай мовы, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, рускай літаратуры, сацыялогіі журналістыкі, рамана-германскіх моў, гісторыі Расіі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, канстытуцыйнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, філасофіі і сацыяльных навук, міжнародных адносін, дыпламатычнай і консульскай службы, усходніх моў, англійскай мовы, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, радыёфізікі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, лікавых метадаў і праграміравання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, рускай літаратуры, гісторыі заходніх і паўднёвых славян, англійскай мовы, міжнародных эканамічных адносін, рамана-германскіх моў, фізічнага выхавання і спорту;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** геадэзіі і картаграфіі, гісторыі беларускай мовы, рамана-германскіх моў, крыніцазнаўства і музеязнаўства, псіхалогіі, усходніх моў, англійскай мовы, фізічнага выхавання і спорту;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** фізічнай оптыкі, сістэмнага аналізу, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл.: 226-59-39.**

*А Ў НАС! А Ў ВАС?*

# МЫ ГАВОРЫМ І СПЯВАЕМ ПА-РУСКУ

У Белдзяржуніверсітэце існуе падрыхтоўчы факультэт, дзе займаюцца замежныя студэнты. Хлопцы і дзяўчаты з Кітая, Сірыі, Лівана, В'етнама год вывучаюць рускую мову, каб мець магчымасць слухаць лекцыю па-руску. І толькі пасля гэтага паступаюць у розныя ВНУ Беларусі. І кожны год навучэнцы збіраюцца на вечарыны, каб падвесці вынікі сваёй амаль гадавой працы: пачытаць вершы па-руску, паспяваць ці проста пагутарыць і сфатаграфавацца з выкладчыкамі.

Так было і цяпер. Студэнты сабраліся ў сталоўцы, якая знаходзіцца ў будынку інтэрната № 5. Мне падалося, што я трапіла на вялікае сямейнае свята. Быццам сустрэліся браты і сёстры, якія доўга не бачыліся і дзяліліся навінамі.

*"Шар земной, ты словно*
*круглый стол,*
*За который дружною*
*семьей*
*Сядут все, довольные*
*собой.*
*Белый, черный, желтый —*
*все равны.*
*Мира мы хотим*
*и тишины",*

— чуліся словы вядучага на самым пачатку вечарыны.

Вядучыя Ньят Лінь (В'етнам), Ізен Мінь (Кітай), Ферас Салун (Сірыя) спрабавалі стварыць утульныя абставіны. Нават прамовы афіцыйных асоб выглядалі не зусім афіцыйнымі. Прарэктар Уладзімір Аркадзьевіч Астапенка зычыў навучэнцам поспехаў на ўступных іспытах. А дэкан факультэта Анатоль Васільевіч Паўлаў наогул не чакаў, што яму не проста дадуць слова, а яшчэ і папросяць заспяваць. Што ён і зрабіў з вялікім задавальненнем і даволі прафесійна. Усе з зачараваннем слухалі раманс "Белая акацыя" з кінастужкі "Дні Турбіных".

На кожным свяце не абыходзіцца без гасцей. Танцавальны ансамбль Палаца моладзі пазнаёміў студэнтаў з далёкага замежжа з беларускімі танцамі. А зусім юныя танцоры Алена Праконіна і Кірыл Масалаткін прымусілі ўсіх апладзіраваць да болю ў далонях.

А скончылася ўсё дыскатэкай.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

*ВЫСТАВЫ*

# ВЯРТАННЕ ДА ТРАДЫЦЫЙ

Сёння ні для каго не сакрэт, што захаванне трывалых сувязей са сваёй спадчынай, з уласнымі каранямі з'яўляецца важнейшай умовай жыццядзейнасці любой нацыянальнай культуры. У наш напружаны час камп'ютэрызацыі вельмі важна захаваць гэтую непарыўную сувязь. Яшчэ адзін крок на гэтым шляху быў зроблены калектывам педагогаў інтэрната № 7 Белдзяржуніверсітэта і, зразумела, студэнтамі механіка-матэматычнага і філалагічнага факультэтаў.

З выдатнымі ўзорамі народнай вышыўкі, ручнога вязання можна было пазнаёміцца на выставе, якая ладзілася ў памяшканні інтэрната № 7 з 28 красавіка па 5 мая гэтага года. Дзяўчаты — удзельніцы гурткоў народнай творчасці і вязання прапанавалі прыгожа вышытыя абрусы, сурвэткі, святочны ручнік і многія іншыя рэчы. Уласнымі рукамі яны звязалі шмат прадметаў хатняга адзення. Вышытыя крыжыкам і гладдзю малюнкі — гэта сапраўдныя мастацкія творы, якія сведчаць, што іх аўтары ўклалі ў сваю работу не толькі ўменне, але і часцінку ўласнай душы.



Гуртком народнай вышыўкі кіруе студэнтка 3-га курса механіка-матэматычнага факультэта Святлана Краўчонак, а тых, хто захапляецца вязаннем, аб'яднала педагог-арганізатар Т.А. Красоўская. Радуюць вока такія работы. Шкада толькі, што не часта мы можам пазнаёміцца з творчасцю нашых студэнтаў. І справа тут, відаць, не толькі ў іх сціпласці ці нежаданні ствараць прыгожае. Проста маладым дзяўчатам і хлопцам неабходна дапамагаць добрым словам, карысннай парадай. Удзельнікаў гэтай выставы падтрымалі педагогі-арганізатары і сацыяльныя педагогі.

Атрымалася сапраўднае свята. Дзяўчаты адчулі сябе яго героямі. Вялікі дзякуй ім за тыя асалоду і задавальненне, што атрымалі ўсе, хто наведаў выставу. Вельмі хочацца, каб падобныя мерапрыемствы сталі традыцыйнымі. Яны вучаць любіць і шанаваць прыгажосць, якая, у рэшце рэшт, выратуе свет ад бездухоўнасці.

*Ірына КЛІМКОВІЧ,*
*педагог-арганізатар*
*інтэрната № 7 БДУ*


*АБ'ЯВЫ*

**Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта**

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

вядучага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі лазерных сістэм;
вядучага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі "Фізіка іона-плазменнай мадыфікацыі цвёрдых цел";
вядучага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі фізікі і тэхнікі паўправаднікоў;
старшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі малекулярнай фатонікі;
малодшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі лазерных сістэм;
навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі "Фізіка іона-плазменнай мадыфікацыі цвёрдых цел";
малодшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі фізікі электронных матэрыялаў;
малодшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі возеразнаўства — 3;
малодшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчай лабараторыі геаэкалагічных праблем — 2.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл.: 226-47-64.**

**Навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі**

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:*

старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці аўтаматызацыя фізічных даследаванняў (1);
навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці фізіка цвёрдага цела (1);
малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці радыёфізіка і электроніка (1).

Тэрмін конкурсу — месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл.: 277-56-17, 277-48-43.**

# Я + Я

Блізняты — людзі унікальныя. Шмат пра іх расказваюць гісторый. Шмат чаго праўдзівага, але хапае і выдумак. Аднак амаль усе лічаць гэтых двух знешне падобных адзін да аднаго людзей ледзь не адным, адмаўляючы ім у індывідуальнасці. Развеяць гэты міф вырашыла дырэкцыя універсітэцкага студэнцкага гарадка.

13 мая а васемнаццатай гадзіне ў сталоўцы інтэрната нумар пяць пройдзе шоу блізнятаў. У шоу возьмуць удзел сем пар блізнятаў, якія жывуць у інтэрнатах БДУ.

Усе блізняты, акрамя Вольгі і Таццяны Тычынскіх, вучацца разам са сваімі палавінкамі. А Вольга і Таццяна займаюцца на зусім розных факультэтах, што лішні раз падкрэслівае іх толькі знешняе падабенства. Адна вывучае хімію, а другая вучыцца на англійскім аддзяленні філалагічнага факультэта. Як хтосьці пажартаваў на рэпетыцыях, адной падабаецца перастаўляць прабіркі, а другой — падпісваць іх на англійскай мове.

Усе дзеянні на вечарыне будуць адбывацца ўперамешку з дыскатэкай, якую давядзецца перыядычна перарываць хвілін на дзесяць, каб прадставіць галоўных герояў. Знаёмства з залай будзе адбывацца так: вядучая Людміла Зубальская задасць блізнятам некалькі пытанняў, а потым дзяўчаты і два хлопцы пакажуць тое, на што яны здольныя. Хтосьці прачытае свае вершы ці праспявае свае песні, іншы проста спяе пад гітару альбо станцуе. Але гэта ні ў якім разе не конкурс. Журы тут не будзе, а значыць, не будзе ні пераможцаў, ні пераможаных.

Галоўная мэта гэтага мерапрыемства — не проста прыцягнуць увагу да блізнятаў, але і паказаць, што пры вельмі вялікай падобнасці ў абліччы, людзі могуць быць зусім не падобныя ў душы.

З удзельніцамі шоу Ганнай і Марыяй Кавальчукамі мне пашчасціла навучацца на адным аддзяленні факультэта журналістыкі ўжо чацвёрты год. За гэты час заўважыла адну цікавую рэч. Калі да нас прыходзіць новы выкладчык і пачынаецца першая пераклічка, то, дайшоўшы да другога прозвішча Кавальчук, ён ці яна заўсёды падымае ў непаразуменні вочы на дзяўчат і здзіўлена пытае, ці не сёстры яны. На курсе нават пачалі жартаваць, што ў іх проста аднолькавае прозвішча. Але ўжо з другой лекцыі пачынаюцца праблемы іншага плану... Я сама пачала адрозніваць іх дзесьці ў сярэдзіне другога курса. І толькі адзін выкладчык, нават не падымаючы вачэй, вызначыў, што яны блізняты. Як потым выявілася, у яго ў самога нарадзілася пара блізнятаў.

— Да блізнятаў, — завязалася ў мяне аднойчы размова з Марыяй, калі мы спяшаліся ў метро, — ставіліся ў розныя часы розныя людзі па-рознаму. Некаторыя лічылі, што на жанчыне, у якой нарадзілася двойня, і яе дзецях ляжыць праклён, што яны знаюцца з чортам. А некаторыя — наадварот, адносілі яе ледзь не да ліку святых. Калі мы ўжо займаліся на факультэце журналістыкі, пазнаёміліся з адным замежным студэнтам, які жыў у суседнім блоку інтэрната. Дык у іх краіне існуе павер'е: калі з чалавекам нешта дрэннае здарыцца (ён захварэе ці яшчэ штосьці), то трэба дакрануцца да матулі блізнятаў — і ўсе хваробы як рукой здыме. І калі ён зламаў нагу, то ўвесь час прасіў прывесці да яго нашу маці.

**— У вас ёсць якія-небудзь свае прыкметы ці звычаі?**

— Што датычыць вучобы, то калі адна па якой-небудзь прычыне не можа з'явіцца на заняткі, другая па меры магчымасці спрабуе не трапляцца на вочы выкладчыкам. Яны ж нас амаль не адрозніваюць і не ведаюць, каго менавіта няма ва універсітэце.

**— Марыя, а вы часта скарыстоўваеце сваё падабенства ў карыслівых мэтах?**

— Усялякае здараецца. Экзамены здаваць адна за адну не даводзілася, а вось залік аднойчы на малодшых курсах Ганна за мяне здавала. І то не таму, што я чагосьці не ведала. Проста не было мяне на факультэце, а залік я атрымала "аўтаматам". Вось Ганна спачатку свой залік атрымала, а пасля крышку пераапранулася, распусціла валасы і зайшла з маёй залікоўкай. Можна сказаць, што ў нас адзін пашпарт на дваіх. Не, не тое, каб зусім адзін, вядома ж, у Ганны — свой, а ў мяне — свой. Але заўсёды пры сабе гэты дакумент носіць толькі адна з нас. А другая пазычае, калі ён ёй патрэбен. На спатканні ходзім адна за адну.

**— А хлопцаў адна ў адной не адбіваеце?**

— Ніколі такога не было. Больш скажу, пасля спаткання мы нават можам прызнацца, што прыйшла другая. Аднойчы сустрэлася ў горадзе з адным знаёмым Ганны. А ён нават не падазраваў, што ў яе наогул ёсць сястра, не гаворачы ўжо пра блізнятку, вось і прыняў мяне за яе. Вечар быў цудоўны. А назаўтра ў інтэрнаце перад ім прадсталі двое... А калі даведаўся, што была з ім не тая...

**— Разлаваўся ці пакрыўдзіўся?**

— Рассмяяўся. І ў наступны раз паабяцаў быць больш уважлівым.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*



# ЯК МНОГА Ў ГЭТЫМ ГУКУ...

Калі перафразіраваць класіка, можна амаль з упэўненасцю сцвярджаць: "Весна! Как много в этом звуке для сердца юного слилось! Как много в нем отозвалось!" І злілося, і адгукнулася агульнауніверсітэцкім конкурсам аўтараў і выканаўцаў паэтычнай песні "ФЭСТ А-99", які праходзіў 22 і 23 красавіка ў сценах актавай залы галоўнага корпуса БДУ. Арганізатар конкурсу — дырэкцыя па справах культуры Белдзяржуніверсітэта, а калі быць больш дакладным — рэжысёр-пастаноўшчык дырэкцыі Аксана Чупрына.

Гармонія слова і музыкі, развагі выканаўцаў пра сэнс жыцця і, што самае галоўнае, прысутнасць на сцэне старажытнагрэчаскага апекуна аўтарскай песні (эмблема конкурсу ў выглядзе забаўнай істоты з жалейкай) рабілі абставіны вельмі ўзнёслымі. Дарэчы, у наступным годзе дырэкцыяй па справах культуры будзе праводзіцца конкурс на лепшае імя для гэтага апекуна і на лепшую песню, прысвечаную яму. Таму пачынайце рыхтавацца ўжо зараз!

Нямала давялося папрацаваць аўтарытэтнаму журы — як выканальніцкаму (І. Мяцельскі, рэжысёр рэдакцыі літаратурна-мастацкіх праграм Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, С. Саскавец, прадзюсер і аўтар-выканаўца, М. Мантвалінскі, рэжысёр тэлебачання, Г. Тучкоўскі, супрацоўнік БДУ, намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі інвалідаў Чарнобыля, Я. Макарэвіч, лаўрэат фестывалю "Афганістан баліць у маёй душы"), так і аўтарскаму (паэт Дз. Строцаў, А. Казанцава, лаўрэат усесаюзнага фестывалю аўтарскай песні 1988 года ў Таліне, член Саюза пісьменнікаў Масквы, С. Шпілеўскі, дырэктар радыё "Стыль", А. Матвееў, паэт і ветэран вайны ў Афганістане, Н. Кудрэйка, рэдактар музычных праграм Беларускага радыё, аўтар перадачы "Мая музыка"). Няпроста было аддаць перавагу некаму аднаму: кожны, хто выступаў гэтым вечарам на сцэне, быў цікавы і таленавіты па-свойму.



У выніку пераможцамі конкурсу сталі наступныя выканаўцы:

у намінацыі "Лепшы аўтар-выканаўца" — Аляксандра Ляўкевіч з Інстытута культуры (ІІІ месца), дуэт Ягор Найдовіч — Віктар Сямашка з факультэта журналістыкі БДУ (ІІ месца), дуэт братоў Яцукевічаў з факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (І месца);

у намінацыі "Лепшы выканаўца" — Алена Крошка з філасофска-эканамічнага факультэта (ІІІ месца), Георгій Калдун з геафака (ІІ месца), дуэт сясцёр Мінскіх (І месца).

Апрача таго, былі спецыяльныя прызы і падарункі ў розных намінацыях.

*Кацярына САЛАДУХА,*
*інспектар упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю*

# Мары аб працы — рэальныя

Каб жыць — трэба есці, каб есці — патрэбны грошы, каб былі грошы — неабходна працаваць... А дзе менавіта можна знайсці тую магчымасць зарабіць хоць капейку? Вечнае пытанне заўжды хвалявала і будзе хвалявыць студэнтаў. Акрамя таго, што студэнт павінен добра і смачна есці (каб "на выдатна" працавалі мазгі), яму неабходна падчас навучання стаць і духоўна багатым: хоць раз у месяц наведаць кінатэатр, выставу, канцэрт любімай групы, тэатр, дыскатэку...

Вось і круцяцца студэнты, як вавёркі ў коле. Нехта падпрацоўвае "мойшчыкам" машын, нехта — рэкламным агентам, кур'ерам або целаахоўнікам (калі дазваляюць мускулы і рост). Як кажуць, праца — не надта, аднак... аплочваецца. Але такіх шчаслівчыкаў, на жаль, нямнога. Прыблізна каля 60% моладзі ўсё яшчэ сядзіць на карку сваіх бацькоў. Пры гэтым адчуваюць яны сябе вельмі нядрэнна. Дзе ж ваша сумленне, юнакі ды дзяўчаты? Годзе ўжо з бацькоў цягнуць, вы ж дарослыя і самі можаце паклапаціцца аб сваім прыбытку, самі здольныя зарабляць грошы на ўласныя патрэбы.

Менавіта для тых, хто мае жаданне працаваць у вольны ад заняткаў час, быў створаны ў верасні 1998 года ў БДУ Цэнтр занятасці Беларускага патрыятычнага саюза моладзі. Вялізная чарга ля прыёмнага пакоя даказвае, што стаў ён добрым і надзейным пасрэднікам у пошуку працы.

Асноўная мэта Цэнтра — падрыхтоўка моладзі да самастойнага выхаду на рынак працы і паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту студэнтаў, якіх традыцыйна ва ўсе часы называлі беднымі, а таксама дапамога выпускнікам і студэнтам ВНУ рэспублікі ў працаўладкаванні. Цэнтр цесна ўзаемадзейнічае з іншымі навучальнымі ўстановамі, гарадскімі цэнтрамі занятасці насельніцтва, рознымі прадпрыемствамі і арганізацыямі. Менавіта тут дапамогуць атрымаць як часовую, так і пастаянную працу, інфармацыю аб вакансіях. Дарэчы, банк дадзеных пра вольныя працоўныя месцы абнаўляецца кожны тыдзень (па чацвяргах).

Калі вы вырашылі звярнуцца па дапамогу ў Цэнтр занятасці БПСМ, дык накіроўвайцеся да галоўнага навучальнага корпуса, прыхапіўшы з сабой пашпарт і студэнцкі білет. У пакоі №205 супрацоўнікі Цэнтра (таксама студэнты розных факультэтаў) падбяруць зручнае месца працы.

— Менавіта тут, у Цэнтры занятасці, я атрымаў працу вартаўніка, — распавядае Дзяніс з факультэта радыёфізікі і электронікі. — Атрымліваю 5 мільёнаў і вельмі ўдзячны за дапамогу.



Так што, калі ў вашых кішэнях гуляе вецер, вашы фінансы спяваюць рамансы, — хутчэй спяшайцеся ў галоўны корпус.

Вось што сказаў кіраўнік штаба працоўных спраў камітэта БПСМ Белдзяржуніверсітэта Эдуард Уласаў:

— У час летняга адпачынку мінулага года мы шукалі студэнтаў для будаўнічых работ. У выніку жадаючых аказалася вельмі шмат. Гэты факт і падштурхнуў нас да стварэння структуры, якая займалася б працаўладкаваннем студэнтаў.

**— Якую працу прапаноўвае студэнтам Цэнтр?**

— Усё залежыць ад попыту на рынку працы. У першую чаргу прадпрыемствы маюць патрэбу ў вартаўніках, кур'ерах, прыбіральшчыках. Студэнт яшчэ не валодае спецыяльнымі ведамі па той ці іншай прафесіі. Аднак існуюць і фірмы, гатовыя ўзяць на працу спецыялістаў, якія добра ведаюць камп'ютэр, ці свабодна валодаюць замежнымі мовамі, ці маюць вадзіцельскія правы.

**— І колькі ў сярэднім можа зарабіць студэнт?**

— Адназначнага адказу няма. Працадаўца абгаворвае памер зарплаты, мы ўносім гэтыя звесткі ў камп'ютэр. І ўжо самому студэнту вырашаць: задавальняюць яго гэтыя грошы ці не. У прынцыпе, аклад састаўляе ад паўтара да трынаццаці мільёнаў.

**— Студэнты якіх факультэтаў найчасцей звяртаюцца ў Цэнтр?**

— У лідэрах ходзяць радыёфізічны, юрыдычны, геаграфічны факультэт, фізфак, ФПМІ, мехмат.

**— І каго сярод жадаючых працаваць больш — дзяўчат ці хлопцаў?**

— Як ні дзіўна — дзяўчат. Магчыма, яны проста ў большай ступені жадаюць быць незалежнымі. Аднак апошнім часам усё часцей наведваюцца і хлопцы.

**— А калі студэнт мае жаданне працаваць і летам, вы можаце ў гэтым дапамагчы?**

— Безумоўна. Тым, хто пажадае працаваць і ў час свайго адпачынку, мы прапануем запісацца ў атрады, якія будуць заняты на будоўлі, у летніх дзіцячых лагерах, сельскай гаспадарцы. З аднаго боку, гэта магчымасць падыхаць свежым паветрам, з другога — немалыя грошы.

**— Ці з'яўляецца абавязковай умовай наяўнасць членскага білета БПСМ?**

— Не. Мы рады бачыць усіх студэнтаў. Дый не толькі з нашай навучальнай установы.

Вось так, сябры. Давайце працаваць, бо самі ж ведаеце, што стыпендыя разыходзіцца літаральна за два дні. Прытым у невядомым кірунку. Каб заўсёды былі грошы — неабходна працаваць. А працу знайсці вам дапамогуць у Цэнтры занятасці БПСМ. Я туды ўжо бягу...

*Аляксей МІХАЛЕНЯ,*
*студэнт факультэта журналістыкі*



# У БДУ праходзіць першынство па футболе

Ужо некалькі дзён у Белдзяржуніверсітэце праходзіць першынство сярод факультэтаў па футболе. У гэтым годзе моцна змянілася сетка розыгрышу. Да трынаццаці факультэцкіх каманд далучыліся зборныя спецфакультэта, Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта і нашых кітайскіх сяброў. З нагоды такой вялікай колькасці ўдзельнікаў (усяго 16 камандаў) сёлета гульні адбываюцца ў дзвюх лігах. У вышэйшую ўвайшлі 8 лепшых камандаў па выніках мінулагодняга чэмпіянату: студэнты юрыдычнага факультэта, радыёфізікі і электронікі, геаграфічнага, фізічнага, журналістыкі, філалагічнага факультэта, механіка-матэматычнага і факультэта міжнародных адносін. Менавіта гэтыя зборныя вядуць барацьбу за магчымасць звацца першай камандай універсітэта. Прычым футбалістам, якія зоймуць першае і другое месцы, будзе прысвоены першы разрад. А дзве горшыя каманды (сёмае і восьмае месца) пакінуць вышэйшую лігу і праз год будуць змагацца класам ніжэй. А дзве лепшыя каманды з першай лігі зоймуць іх месца ў вышэйшай лізе.

Спяшайцеся на стадыён спорткомплексу, што на вуліцы Кастрычніцкай. Інтрыга чэмпіянату толькі-толькі закручваецца. Самае цікавае яшчэ наперадзе: гульні за першую тройку, матчы за магчымасць утрымацца ў вышэйшай лізе. А яшчэ вы самі зможаце паўдзельнічаць у выяўленні лепшага іграка турніра.

Гульні праходзяць кожны дзень з 15 гадзін.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

# За дыплом давядзецца плаціць, калі ён не падмацаваны даведкай аб размеркаванні

У пачатку гэтага года было ўведзена істотнае дапаўненне ў парадак размеркавання маладых спецыялістаў. Указам Прэзідэнта ад 1996 года выпускнікам навучальных устаноў гарантавалася прадастаўленне першага працоўнага месца. Цяпер гэтыя гарантыі прадугледжваюць фінансавую адказнасць і працадаўцы, і выпускніка. Цяпер наймальнік не мае права прымаць маладога спецыяліста на работу на працягу 2 гадоў пасля заканчэння ім ВНУ ці сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы без накіравання ці даведкі аб вольным размеркаванні. І не можа звольніць яго на працягу двух гадоў, калі толькі той не парушае груба працоўную дысцыпліну. Інакш працадаўцы давядзецца вярнуць у бюджэт, за кошт якога чалавек вучыўся, выдаткаваныя на яго навучанне сродкі. Для тых, хто не пажадае рабіць гэта добраахвотна, прадугледжаны судовы парадак вылічэння грошай.

Такі ж лёс чакае і студэнтаў-"мэтавікоў", якія адмовіліся без уважлівай прычыны выканаць умовы падпісанага падчас паступлення ў навучальную ўстанову кантракта ці не адпрацавалі поўнасцю азначаны ў дагаворы тэрмін.

Акрамя выдаткаў непасрэдна на навучанне давядзецца вярнуць выплачаную за час навучання стыпендыю, прэміі са стыпендыяльнага фонду... Сума ў выніку атрымліваецца немалая. У залежнасці ад навучальнай установы, сабекошту і прэстыжнасці атрыманай спецыяльнасці — ад 500 да 1500 долараў за кожны год.

Зразумела, на тых, хто вучыўся за уласныя грошы (а такіх сёння каля 40 працэнтаў), гэтае новаўвядзенне не распаўсюджваецца. Механізм атрымання выдаткаваных на навучанне бюджэтных сродкаў пакуль не адпрацаваны. Не выключаны і такі варыянт, як вяртанне да забытай практыкі мінулых часоў, калі навучальная ўстанова цераз пракуратуру апратэстоўвала залічэнне маладога спецыяліста на работу зусім не тым прадпрыемствам, якое пазначана ў накіраванні.

— Дапаўненні ў палажэнне аб размеркаванні маладых спецыялістаў — гэта яшчэ адзін крок па сацыяльнай абароне выпускнікоў, — гаворыць начальнік упраўлення народанасельніцтва Міністэрства працы рэспублікі Пётр Давыдкоў. — Сітуацыя на рынку працы сёння няпростая, важна дапамагчы маладому чалавеку працаўладкавацца і замацавацца на працоўным месцы. Мы ўжо мелі вопыт, калі навучальныя ўстановы ўхіляліся ад удзелу ў працаўладкаванні сваіх выпускнікоў. Скажам, у пачатку 90-х размеркаванне атрымлівалі 50-60 працэнтаў тых, хто закончыў навучальную ўстанову. У 1996 годзе рэальна працаўладкаваліся, напрыклад, 36 працэнтаў выпускнікоў ВНУ, 52 працэнты выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На канец года ў цэнтрах занятасці стаялі на ўліку 4367 маладых спецыялістаў, 2 тысячы з іх прайшлі перападрыхтоўку за кошт фонду спрыяння занятасці. Выпускнікі атрымлівалі дыпломы аб адукацыі, а іх веды аказваліся незапатрабаванымі. Абавязковае з 1997 года размеркаванне падштурхнула навучальныя ўстановы да больш уважлівага вывучэння рынка працы, патрэбы ў кадрах прадпрыемстваў рэспублікі, да ўліку патрабаванняў наймальнікаў.

Вынік не давялося доўга чакаць: у мінулым годзе накіраванне на працу атрымалі 79 працэнтаў выпускнікоў ВНУ. У параўнанні з 1994 годам у два разы зменшылася колькасць тых, хто атрымаў вольнае размеркаванне з-за адсутнасці працоўных месцаў.

— У цэлым сітуацыя з размеркаваннем палепшылася практычна ва ўсіх навучальных установах, — гаворыць галоўны спецыяліст аддзела падрыхоўкі і перападрыхтоўкі кадраў Міністэрства працы Аляксандр Паўляцоў, — але праблема незапатрабаванасці кадраў па-ранейшаму застаецца дастаткова вострай. Хлопцы і дзяўчаты з дыпломамі ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў складаюць цяпер каля 5 працэнтаў усіх зарэгістраваных у службах занятасці рэспублікі беспрацоўных. З года ў год узнікаюць складанасці з працаўладкаваннем выпускнікоў тэхнікумаў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. У Гродзенскай вобласці тры педвучылішчы рыхтуюць выхавальнікаў дзіцячых садкоў, у той час як сетка дашкольных устаноў скарачаецца. На сённяшні дзень у рэспубліцы няма дэфіцыту спецыялістаў. І наўрад ці нам спатрэбіцца такая колькасць менеджэраў, эканамістаў, юрыстаў, якую сёння рыхтуюць дзяржаўныя і недзяржаўныя навучальныя ўстановы. Невыпадкова цяпер распрацоўваецца пытанне аб стварэнні ў Беларусі адзінай сістэмы прафесіянальнай арыентацыі.

Ці даедуць усе маладыя спецыялісты да месца размеркавання, сказаць складана. Тым болей, што прадастаўленае дзяржавай першае працоўнае месца задавальняе не ўсіх. У нетрах Міністэрства адукацыі нейкі час лунала такая ідэя: каб прымусіць выпускнікоў ехаць туды, куды ім ехаць зусім не хочацца, дыплом аб адукацыі выдаваць толькі пасля двух-трохгадовай адпрацоўкі па дзяржаўным размеркаванні. Такі падыход практыкуецца ў некаторых заходніх краінах, але ў нас пакуль не знайшоў падтрымкі і разумення. Цяжка задумваць наперад, ці прыжывецца ён у перспектыве, бо каб атрымаць выпускніка, дастаткова яго зацікавіць, скажам, магчымасцю замежнай стажыроўкі, высокім заробкам, добрымі побытавымі ўмовамі. А гэта ўжо — клопат наймальніка. Дзяржава, у сваю чаргу, прадугледзела кампенсацыйныя меры для цяперашніх выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў усіх тыпаў і формаў уласнасці, якія выязджаюць па размеркаванні ў раёны, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Пасля першага года працы кожнаму з іх належыць аднаразовая дапамога ў памеры 20 мінімальных заробкаў, пасля другога — 25, пасля трэцяга — 30 "мінімалак". Гэтыя грошы не будуць абкладацца падаходным падаткам і гарантуюцца дзяржавай.

*Галіна ТАРАПЕЦКАЯ, "СБ"*



# Фестываль аэробікі

Вялікі спорт — не толькі для моцных і здаровых людзей. Не мае рацыі той, хто адмаўляецца ад усякіх фізічных нагрузак пры першых прыкметах захворвання. У мінулым годзе ў БДУ прайшлі першыя спаборніцтвы па аэробіцы сярод студэнтак спецаддзялення (дзяўчаты з адхіленнямі ў стане здароўя). Гэта была першая ластаўка. Невялікае, але даволі прывабнае, амаль сямейнае, універсітэцкае мерапрыемства.

Мінуў год. Турнір разросся да "Фестывалю аэробікі" і пераехаў з маленечкай утульнай залы аэробікі ў вялікую залу баскетбола, што на другім паверсе спорткомплекса.

Свята складалася з двух аддзяленняў. У першым выступалі каманды-ўдзельніцы: юрысты, геафак, факультэт міжнародных адносін і госці — дзве каманды з фінансава-эканамічнага факультэта. Тут жа паказвалі сваё майстэрства прызёры чэмпіянату Беларусі па спартыўных танцах, прызёры міжнародных конкурсаў Кацярына Полачава і Жан Паўловіч, прызёр міжнародных спаборніцтваў па мастацкай гімнастыцы майстар спорту Вольга Кузьміна, каманды Эканамічнага універсітэта "Секстэт" і "С-3" і зборная каманда ФМА.

А ў другім аддзяленні ўсе жадаючыя маглі пазаймацца аэробікай з Веранікай Садоўнікавай (удзельніцай міжнародных канвенцый Рыбак "Найк", інструктарам па базавай аэробіцы) і Кірылам Дарафеевым (інструктарам міжнароднага класа кампаніі "Найк", пезентарам фітнес-канвенцыі, інструктарам кампаніі "Уорд клас Фітнес карпарэйтэн", г. Масква).

А пачаў свята Віктар Іванавіч Пятроўскі, старшыня спортклуба БДК. Ён выказаў надзею, што калі-небудзь гэты фестываль перарасце ў рэспубліканскі. А вось дэкан факультэта міжнародных адносін Аляксандр Віктаравіч Шарапа спадзяваўся на поспех сваёй каманды. І ён не памыліўся — менавіта дзяўчаты з факультэта міжнародных адносін і сталі першымі. На другое месца журы ў складзе Любові Васільеўны Ісайгевай (старшыня, БДУ), Людмілы Вячаславаўны Максімавай (Медыцынскі інстытут), Галіны Міхайлаўны Баранавай (Тэхналагічны універсітэт), Святланы Васільеўны Слапенінай (БДПА) паставілі каманду "Нябесныя ластаўкі" з Эканамічнага універсітэта. І трэці — наш геафак.

А прызы прадаставілі спонсары: радыё "Бі-Эй", Эканамічны універсітэт, Белдзяржуніверсітэт і містэр Х (чалавек, які пажадаў застацца невядомым). Прыз судзейскіх сімпатый атрымала Наталля Віцінёва з Эканамічнага універсітэта, а сімпатыі гледачоў заваявала Вікторыя Лазарчук з геафака.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

# ЧОРНЫ ЗАМАК ГАЛЬШАНСКІ



## НАРЫС

**Старадаўні Ашмянскі паштовы тракт бяжыць па камяністых раўнінах, праз тутэйшыя мястэчкі, карані якіх вядуць у XII-XIV стагоддзі, узбірацца на ўзгорачкі. Дзівуецца на крыжы і капліцы, што стаяць на раздарожжы ці каля вёсак як абарона ад нячыстай сілы. Абмінае пагоркі з велічнымі касцёламі і цэрквамі, руінамі магнацкіх палацаў і рыцарскімі замкамі. І ў "краіне замкаў і крыжоў" — так некалі называлі паўночна-заходнія раёны Беларусі — замаруджвае свой шлях...**

Гальшаны — адно з такіх старабеларускіх мястэчак на Гродзеншчыне. Паданне распавядае, што аднойчы князь Нарымунт падараваў свайму брату Гольшу мясціны, межы якіх пралягалі ад ракі Віліі да рэчышча балоцістага Карабеля. Князь вельмі любіў паляваць і аднойчы натрапіў на прыгожую гару з маляўнічымі раўнінамі навокал. Там і застаўся жыць Гольша, заснаваў горад і пачаў княжыць. Так з'явіліся Гальшаны, якія і дагэтуль збераглі сваю гісторыю, архітэктурнае аблічча, непаўторны местачковы каларыт, прыгожыя легенды і гасціннасць мясцовых жыхароў.

### ЧОРНЫ ЗАМАК

На ўскраіне Гальшанаў, каля самай шашы, увесь парослы пустазеллем і жыгучкай-крапівой, стаіць знакаміты Чорны замак. "Прататып" таго, аб якім расказаў Уладзімір Караткевіч у рамане "Чорны замак Альшанскі". На жаль, ад самога замка засталіся толькі рэшткі. А калісьці...

Калісьці сучаснікі лічылі Гальшанскі замак самым цудоўным ва ўсім Вялікім княстве. Да 1525 года яго ўладарамі былі князі Гальшанскія, а пасля замужжа Алены Гальшанскай ён перайшоў да не менш знатнага роду Сапегаў.

Гэта быў вялікі прыгожы будынак чатырохкутнай формы з васьміграннымі вежамі. Трохпавярховы замак-палац пасля Сапегаў часта пераходзіў з рук у рукі. У час руска-польскай вайны быў часткова разбураны, пазней тут добра "папрацавалі" шведскія войскі. Не абмінула яго і вайна 1812 года. А ў 1880 новы ўладар Гарбанёў кашчунна ўзарваў вежы і сцены, каб прадаць цэглiны на пабудову карчмы.

Варварствы працягваліся і ў наш час. Спачатку ў замку адчынілі школу пчалярoў, потым — тэхнікум. А пасля цэгла спатрэбілася для будоўлі Дома культуры. І за справу ўзяліся камсамольцы: кожны з іх павінен быў выцягнуць са сцен каля 80 цаглін. Добрага старога вырабу, з адбіткамі рук майстроў, яны трымаліся вельмі моцна, бо былі разлічаныя на стагоддзі.

Скончылася ўсё гібеллю аднаго з хлопцаў. Па адной версіі, на яго абвалілася сцяна, па другой — ён сам не ўтрымаўся на вышыні і разбіўся. Так гэта было ці не, але замак на нейкі час пакінулі ў спакоі. Каб потым зрабіць у двары... жывёльную гаспадарку. І па сівой даўніне бесцырымонна разгульвалі свінні, сляды ад якіх засталіся дагэтуль.

І ўсё ж нават зараз руіны ўражваюць. Узвышаюцца над цаглянымі сценамі кутнія вежы, абваленыя скляпенні адкрываюць позірку рады аркад, напаўзасыпаныя пераходы вядуць у глыбіню падзямелля. Кажуць, што пад замкам знаходзілася шмат розных хадоў, склепаў, калодзежаў. І што ў выпадку небяспекі там магла схавацца добрая палова жыхароў былых Гальшанаў. Другое паданне сцвярджае, што падземны ход вёў у суседні Крэўскі замак. І быў такі вялізарны, што браты Сапегі маглі праімчацца па ім на ліхой тройцы.

На ўзроўні другога паверха замак апярэзвала галерэя. Мабыць, тая, на якой у светлыя ночы можна было ўбачыць цені Белай дамы і Чорнага манаха.

*Чорны замак Альшанскі.*
*Месяц нырае ў хмарах.*
*Вежы туманныя ў змроку*
*сны аб мінулым мараць.*
*Слухаюць вецер золкі,*
*вой далёкі ваўчыны,*
*Слухаюць, як на мурах*
*са страху трасуцца асіны...*
*У, як ціха і мёртва!*
*У, які змрок глыбокі!*
*Ціха! Ты чуеш здалёку*
*ў аркадах бязгучныя крокі!*
*Кожную поўнач такую ў замку,*
*што стыгне ад жаху,*
*Па галерэях праходзіць*
*дама з чорным манахам.*

... У Караткевіча ёсць легенда аб тым, як некалі ў замку жыў стары князь. І была ў яго маладая жонка, якая пакахала высакароднага разбойніка са знатнага роду. І яны вырашылі збегчы, прыхапіўшы частку скарбонкі. Адной цёмнай ноччу палюбоўнікі кінуліся наўцёкі. Але скваліны і жорсткі князь нагнаў уцекачоў і загадаў кінуць іх у падзямелле. Там, замураваныя, яны і знайшлі свой апошні прытулак. З таго часу пры поўным месяцы ў небе на сцяне замка з'яўляюцца два цені — белы і чорны...

### КАСЦЁЛ

У апошняе стагоддзе гальшанскім прывідам стала няўтульна ў разбураным замку. І яны "перасяліліся" ў больш утульнае месцейка — у каталіцкі кляштар ордэна францысканцаў, які адзначыў у мінулым годзе сваё 380-годдзе.

Зараз тут амаль кожную ноч у хадах і галерэях чуваць таямнічыя крокі. Бо ўсе прывіды, якія ўпадабалі кляштар — дзейсныя. Гэта могуць пацвердзіць супрацоўнікі музея, госці і камандзіраваныя, якім з-за адсутнасці ў пасёлку гасцініцы ветліва дазваляе пераначаваць у сваім "рабочым кабінеце" загадчыца філіяла Нацыянальнага мастацкага музея РБ Часлава Акулік.

Гэты маленькі пакойчык, які знаходзіцца ў адзінай вежы кляштара (яго яшчэ называюць "вежай прывідаў"), дзе раней была капліца, прыйшоўся вельмі даспадобы зданям. Самы вядомы прывід — Чорная дама (не блытаць з Белай, якая жыве ў замку). Аб ёй расказвае жудаснае паданне.

...Павел Сапега, мясцовы магнат, будаваў касцёл. І пажадаў, каб будаўніцтва было скончана 6 жніўня 1618 года. А калі не паспеюць у тэрмін майстры — хай крыўдуюць на сябе. Заспяшаліся яны, але раптам адна сцяна абвалілася. Яе аднавілі — і зноў пайшла расколіна. Параіліся майстры і вырашылі: патрэбна таемная ахвяра. А стане ёю тая з іх жонак, якая першая прынясе абед мужу. Вельмі хваляваўся самы малады муляр. І прадчуванне не падманула яго...

Яго юную жонку замуравалі жывой у сцяне. З таго часу што толькі ні бурылася ў Гальшанах, а кляштар як стаяў, так і стаіць. Дама звычайна з'яўляецца ў тую ноч, калі месяц асвятляе наваколле бляклa-жоўтым ліхтарыкам. Тоненькі чорны сілуэт тады добра відаць на фоне акна ці нішы. І тады адбываюцца незвычайныя з'явы: столь змяняе форму, сцены імкнуцца адна да адной і чалавек губляе арыентацыю ў прасторы. Бывае яшчэ і так: гойдаецца чорная жанчына, нібы на арэлях — то ў пакой, то з яго. А тыя, хто бавіць ноч там, як паралізаваныя, назіраюць за ёй. А яна, нагойдаўшыся, пачынае грукаць у вокны, дзверы...

Асабліва прывіды "сімпатызуюць" журналістам: то спалохаюць так, што душа ў пяткі, то азадачаць. Расказваюць пра адзін выпадак. Прыехала неяк сюды БТ на здымкі сюжэту пра Белую даму і Манаха. Здымалі аж да самай ночы, а калі сталі збірацца назад, дзяўчына (якая па сцэнарыю і была дамай) спатыкнулася на старажытных прыступках... Ды так няўдала, што давялося выклікаць хуткую дапамогу і накладаць мноства швоў. Што гэта было — недарэчны выпадак ці іншае, хто зараз ведае?

Легенды легендамі, але некалькі год таму пачалі рэстаўрацыю касцёла з кляштарам. Расчынілі скляпенні і... пад адной сцяной знайшлі замураваны шкілет. Мяркуючы па ўсім, ён належаў маладой дзяўчыне. Вось і яшчэ адна гальшанская загадка.

### ГАРАДЗІШЧА

Каля мястэчка ёсць вялізная гара. Гэта гарадзішча 12—13 стагоддзяў. Яно таксама мае сваю легенду. І нават некалькі... Вось адна з іх. Некалі на гэтай гары стаяў касцёл, які аднойчы праваліўся пад зямлю ў імгненне вока. Засталася адтуліна дыяметрам крыху менш за метр. Туды кідалі каменьчыкі, манеткі і слухалі, як доўга яны ляцяць. Паступова дзіра звузілася і знікла. Але да гэтых часоў можна ў свята легчы на зямлю і прыкласці вуха, а калі пашчасціць — пачуеш, як звіняць званы...

На гарадзішчы і зараз знаходзяць рэшткі старадаўніх рэчаў. Іх можна ўбачыць у гісторыка-краязнаўчым музеі. Яго дырэктар-"летапісец" Эдуард Корзюк больш чым за 30 гадоў сабраў у ім усю гісторыю Гальшанаў аж да нашых дзён. Тут жа пад шклом — ліст Караткевіча да гальшанскіх школьнікаў з вельмі актуальным наказам напрыканцы: "І яшчэ старайцеся не бурыць тое, з даўніны, што дасталася вам у вашыя рукі..." Бо хто не памятае гісторыі, не мае будучыні.

Цёплы аранжавы вечар апускаецца на Гальшаны. Ахутвае стары млын, маленькую царкву і капліцу, касцёл, руіны Чорнага замка, які аказаўся зусім не "чорны". Паступова прачынаюцца і рыхтуюцца да ночы прывіды з кляштара. Павольна прагульваюцца па галерэі дзве постаці: маленькая жаночая ў белай сукенцы ласкава трымае пад руку манаха.

А па старых ціхіх вулачках вандруе Сівая Легенда.

*Наталля ХАМУТОЎСКАЯ*
*Мінск–Гальшаны–Мінск*

# Затертые в снегах

Про наши дороги ходит много легенд с незапамятных времен. Еще чаще про них складывают витиеватые многоэтажные нецензурные выражения. Но оказалось, что и у бездорожья есть свои поклонники. В марте они собрались на своих джипах в Хатынском лесу, что под Логойском. Там проходили внедорожные соревнования, организованные Белорусским клубом "4х4". Планировались эти гонки на конец февраля. Но непредвиденный снегопад спутал все карты, и соревнования пришлось перенести на неделю.



Снега за это время в лесу, правда, не сильно поубавилось. Он только слежался и осел. Правда, это не сделало трассу намного проходимее, скорее наоборот. Подтаявший снег лип к колесам, которые то и дело буксовали.

Но природные катаклизмы шестерых участников гонок не волновали. Посадка у машин высокая, полный привод — словом, вездеходы. Причем не только дорогие блестящие "иностранцы", но и "отечественная" "Нива" и два УАЗа. Ориентироваться предстояло по "легенде" — схематически обозначенному маршруту. Журналистов определили в джипы к гонщикам, чтобы они на собственной шкуре почувствовали все прелести соревнований. Так, мы с радиожурналистом Андреем Синицей оказались в "Тойоте". Хотя в нашей стране и ходит много анекдотов про "новых" русских и банкиров, но владельцы джипа оказались веселыми компанейскими ребятами. Автомобиль этот они купили специально, чтобы участвовать в гонках. Для парадных выездов в гаражах стоят "мерседесы".

Организаторы пообещали тридцать два километра трассы первоклассной непроходимости. Да плюс еще несколько спецучастков — крутых горок и даже небольшое болото. Один из организаторов с гордостью сообщил, что накануне до двух часов ночи "пробивал" в лесу трассу. Уже тогда у некоторых участников закрались подозрения насчет успеха мероприятия... Но тут объявили старт, и автомобили, натужно урча, рванули вперед, навстречу приключениям с острыми ощущениями.

Чтобы не создавать толкучки на тесных лесных просеках, гонщики стартовали с разницей в двадцать минут. Нашей "Тойоте" выпало пуститься в путь первой.

Уже на первых метрах трассы стало ясно: по зимнему лесу не погоняешь. Проходимость дороги — на втором месте после сугроба. Джип еле двигался по глубокому (выше колена) снегу, загребая его мостами и все время норовя сесть днищем. Что, в общем-то, и случилось уже через пятнадцать минут после старта. Чертыхаясь, вылезли из джипа. Попробовали толкнуть — бесполезно. Как мертвому припарка. Тогда стали активно откапывать колеса, напряженно прислушиваясь к лесным звукам — далеко ли соперник. Но машина села в снег надолго. Что только мы ни делали, чтобы вызволить ее из плена: и копали, и бревна под колеса подкладывали, и лебедку приспосабливали... Наконец, после получасовых мучений двинулись дальше. Вымокшие по пояс, но крайне довольные первой победой над стихией.

Особенно радовались водитель Витя и штурман Саша:

— Хорошо, что вы с нами поехали, — говорил Витя. — Если бы только вдвоем, ни в жизнь не выбрались. Мужики, если гонку выиграем — с меня ресторан и баня. По полной программе, как положено.

Однако вскоре наше настроение испортил появившийся сзади "уазик". Легенькая машина, подпрыгивая на кочках, достаточно легко преодолевала все препятствия. УАЗ быстро догонял нас и, в конце концов, перегнал. В условиях бездорожья его экипаж нашел самый простой выход: пустил впереди себя пару человек с лопатами, которые и расчищали ему путь.

Мы тоже сделали нововведение: все, кроме водителя, повисли на заднем бампере джипа, как на запятках кареты. Хочешь не хочешь — лишние двести килограммов нагрузки на задние колеса, и они меньше буксуют. И потом, в случае чего можно быстрее соскочить и вовремя присоединить свои скромные человеческие силы к усилиям мотора.

Гонка пошла веселей. Впереди то и дело маячил "уазик". Ему оторваться так и не удалось. Приспособившись к заснеженной дороге, Витя без труда нагнал его. Приходилось каждый раз делать перекур в ожидании того момента, когда соперник удалялся метров на сто. Обгон в лесу — вещь практически невозможная. Вокруг колеи непролазный снег. Залезешь в него — не выберешься. Так и ехали друг за дружкой километра три до первого контроля времени.

Там "уазик" благородно пропустил нас вперед. Дорога пошла лесом, где заносов было поменьше. Джип несся между деревьями. Развеселый экипаж, опьяненный скоростью, радостно горланил песни, то и дело уворачиваясь от веток, которые немилосердно хлестали по крыше машины. Наконец добрались до первого спецучастка — крутой горки. С ходу препятствие взять не смогли. Тут нам посоветовали добрые люди: "Вы назад подайте, а потом еще разок с разгона попытайтесь". Так и сделали. Но когда отъехали назад, случайно сели в снег. Вскоре к горе подъехали еще трое участников. Своими силами забраться на высотку никто не смог. Скооперировались. По очереди машины буквально на руках заносили наверх. Только часа через полтора перевели дух.

На этом участке отличился фотокор газеты "На страже" Алексей Матюш. Когда его "уазик" штурмовал спецучасток, Алексей мирно сидел внутри и выливал водичку из своих резиновых сапог. Тут почувствовал — дело плохо: машина буксует. И он как был, босиком, выскочил и стал самоотверженно толкать автомобиль, оставляя следы снежного человека на дороге.

Дальше трасса шла по низине. Машины ползли по ней с черепашьей скоростью. Но, наконец, самый сложный участок позади. Уставшие, мокрые по пояс, мы залезли в "Тойоту". Она уже самостоятельно неплохо справлялась с дорогой.

...Соревнования закончились перед очередной горкой, уходящей в даль лесных сумерек. Бедный УАЗ больше часа безуспешно пыхтел на этом участке. Остальные уныло ждали внизу. Более чем за шесть часов проехали около двенадцати километров. А впереди еще почти двадцать плюс изюминка трассы — небольшое болото. Словом, на общем совете порешили: хорошего понемногу — пора домой. Вот только в какую сторону ехать, чтобы выбраться к шоссе, никто не знал. Вскрыли пакет с картой. По правилам соревнований это можно было делать, только если сходишь с трассы. При свете карманного фонарика стали "привязывать" план к местности. И тут по лесу поплыл поток ругательств.

— За такие карты убивать надо, – подвел итог водитель УАЗа.

И действительно — стоило. Сделали карту на ксероксе, с очень условными знаками. Кое-как мы разобрали маршрут спасения. Развернулись и двинулись в обратный путь. Ехали с частыми остановками: у "сузуки" стал перегреваться мотор. Нежная японская техника не выдерживала тягот нашей зимы. Минут по двадцать приходилось "отдыхать" в лесу.

Банкиры уже начали нервничать.

— Дома разбор полетов будет, — задумчиво сказал Витя. — Жене сказал, что приеду часа в четыре. Уже девять, и когда мы еще отсюда выберемся — неизвестно. Да и машин жалко: посадим тут сцепление.

По радио в машине как раз передали песню из всем надоевшего фильма "Титаник". Она, кстати, как нельзя лучше подходила к моменту.

Километра через четыре нагнали еще одного участника на УАЗе. Как эта машина забралась в лес так далеко — одному Богу известно: шины "лысые", еле протектор просматривается, мотор глохнет на холостых оборотах, аккумулятор барахлит... Застрял советский джип перед небольшой высоткой. Что ж делать — стали помогать сопернику. Хотя и соперников-то тут уже не было: просто друзья по несчастью.

Рыча мотором, "уазик" разогнался и взлетел на середину горочки. Тут мы его "подхватили" на руки и начали яростно толкать. Да, автомобили в советские времена делали на совесть: толщина металла вполне могла потягаться с бронетранспортером. К тому же, как только наши усилия ослабевали, машина опять скатывалась вниз.

— Мужик, ты хоть "ручником" иногда пользуйся, — посоветовали водителю.

— Ну, вы даете. Тачке двадцать восемь лет, а они хотят, чтобы у нее "ручник" был, — удивленно ответил он.

Тогда с машиной стало окончательно все ясно. Подцепили ее на буксир и все-таки затянули УАЗ наверх.

...Только в одиннадцатом часу ночи наша колонна машин добралась до старта. Организаторы, оказалось, уже поехали искать нас в лес. Но, как потом выяснилось, "сломались" там. В Минск они вернулись только поздно ночью. Все сразу рванули к телефону: на старте была радиосвязь. После разговора с облегчением вздыхали: жены теперь не волнуются.

Победителей в этих соревнованиях не было. Их даже не пытались определять. Ни один из участников не доехал до финиша. Да и на старт-то все джипы вернулись дружно и организованно. Решили, что победила, как говорится, дружба. Оно, в общем-то, так и было. Только благодаря взаимовыручке мы смогли выбраться из этого леса.

*Владимир ВОЛЧКОВ*

# ВАНДРОЎКА ПА МУЗЕІ ЗЕМЛЯЗНАЎСТВА

Сёння мы затрымаемся каля вітрыны "Фізічныя ўласцівасці мінералаў", дзе месцяцца зялёныя самацветы: ізумруд, хрызапраз, малахіт, уваравіт, дыяптаз, нефрыт, амазаніт, хрызакола, фуксіт, афікальцыт, гарніярыт, змеявік і іншыя. Усе яны маюць сваю гісторыю, вельмі патрэбныя чалавеку, лічацца шчаслівымі камянямі месяца мая.

Самы прывабны сярод іх — ізумруд. Яго абмінуць нельга. З пачуццём вялікай павагі мы пакланяемся гэтаму сімвалу прыгажосці прыроды, вясны і юнацтва, радасці і міру, надзеі і ўспамінаў. У прыродзе не існуе больш такой цудоўнай зеляніны, як у ізумруду. Вакол яго нават паветра выпраменьвае таямнічае святло. Вядома, што зялёны колер нармалізуе сардэчную дзейнасць, стабілізуе артэрыяльны ціск, супакойвае нервовую сістэму, здымае напружанне, лечыць.



Ізумруд у пародзе

Ізумруд — зялёны берыл, у даўніну яго называлі смарагдам, што ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае "каштоўны зялёны камень". Са старажытнасці і да нашага часу камень з'яўляецца элітным, 1-й катэгорыі каштоўнасці. Хімічная формула — $Al_2Be_3[Si_6O_{18}]$, належыць класу сілікатаў. Цэніцца ў першую чаргу яго прыгажосць, рэдкасць, высокая цвёрдасць, аптычныя і іншыя ўласцівасці. Колер, абумоўлены дамешкам хрому, прыемны для вока, гэта колер жыцця і гармоніі. З задавальненнем мы глядзім на зялёную траву, зялёнае лісце, а камень зачароўвае яшчэ мностваm адценняў, малюнкаў і сваёй гісторыяй. Ён вандруе са стагоддзя ў стагоддзе па падручніках, многіх раманах, паэмах, легендах... Ізумруд ведалі амаль ва ўсіх краінах, але жаданым упрыгожаннем ён быў толькі ў некаторых людзей вышэйшага кола (многія ўзоры ізумрудаў ацэньваюцца вышэй за дыяменты).

Радовішчы ізумрудаў распрацоўваліся тры тысячагоддзі таму ў Аравійскай пустыні. У антычны час набылі славу скарбніцы Клеапатры ў Верхнім Егіпце. Вядомыя ізумруды былі і ў Вавілоне. У джунглях у часы інкаў здабывалі іх на тэрыторыі сучаснай Калумбіі, славутыя капальні знаходзяцца там і зараз. Сярод непаўторных узораў гэтых мясцін — тры самыя буйныя крышталі, цяпер яны захоўваюцца ў музеі антрапалогіі ў Багаце: адзін з іх, "Эмілія", важыць ажно 1795 каратаў. Гэта — нацыянальнае багацце краіны. Унікальныя па велічыні і выдатнай якасці "Крышталь з Гачалы" — 7025 каратаў, "Аўстрыйскі ізумруд" — 2681 карат, "Дэваншырскі" — 1386 каратаў (самы правільны шасціграннік) і адзін з сямі гістарычных камянёў Алмазнага фонду ў Маскве квадратны ізумруд, адзіны ў сваім родзе, таксама знойдзены ў Калумбіі. У Венскай дзяржаўнай калекцыі экспаніруецца пасудзіна ў 2680 каратаў, выразаная ў XVIII стагоддзі знакамітым ювелірам Дыянісіем Мізроні з прыгожага цёмна-зялёнага калумбійскага каменя. Адна з буйнейшых у свеце калекцый ізумрудаў месціцца ў Стамбуле.

Багатыя радовішчы ізумрудаў ёсць на Урале. Уральскія каштоўныя ўзоры знаходзяцца ў многіх музеях свету, ёсць яны і ў музеі землязнаўства Белдзяржуніверсітэта. А вось самы цікавы крышталь, знойдзены ўральскімі сялянамі ў 1831 годзе, — "Ізумруд Каковіна", вага якога 11000 каратаў, захоўваецца ў мінералагічным музеі імя А. Я. Ферсмана ў Маскве. Доўга ён блукаў па Расіі, Украіне, знаходзіўся ў Вене, яго некалькі разоў выкрадалі, прадавалі на аўкцыёнах, пакуль царскі ўрад не выкупіў самацвет і не вярнуў яго на радзіму. Прыгожыя ізумруды ёсць у Збройнай палаце ў вітрынах з абразамі і евангеллямі. Цудоўнымі ізумрудамі ўпрыгожвалі манархі сваё адзенне. Знакамітая шапка Манамаха, парфіры і бірмы на дзяржаўных плячах, скіпетры і інш. з'яўляюцца скарбонкамі каштоўнасцей.

Прырода ўвесь час здзіўляе сваёй шчодрасцю, калі адкрывае свае таямнічыя скарбніцы. У Расіі ў 1978 годзе ў Екацярынбургскай вобласці (тады яшчэ Свярдлоўскай) быў знойдзены ізумруд "Славуты ўральскі" (вага — 3362,5 карата), і зусім нядаўна ў гэтым месцы новая знаходка — мінералагічны шэдэўр, падобнага да якога ў свеце няма. Гэта вельмі прыгожая друза (зросткі крышталёў) ізумруду вагой 9000 каратаў. Алмазны фонд Расіі папаўняецца каштоўнымі шэдэўрамі.

У наш час чацвёртую частку сусветнай здабычы ізумрудаў даюць радовішчы



"Вялікі букет".
Брыльянты, ізумруды. Каля 1760 г.

Бразіліі. Пастаўляюць гэты прыгожы самацвет ПАР, Мазамбік, Аўстралія, Зімбабве, Замбія, Індыя, Пакістан, Аўстрыя, Нарвегія і іншыя краіны. Трэба адзначыць, што толькі невялікая колькасць ізумрудаў апрацоўваецца ў тых краінах, дзе здабываецца. Асноўная частка высакаякасных камянёў трапляе ў Ізраіль, Германію, ЗША, Англію і іншыя краіны.

Зараз шырока выкарыстоўваюцца ненатуральныя, сінтэтычныя камяні і імітацыі — іншыя мінералы, якія знешне нагадваюць ізумруд. Аднак іх можна адрозніць па фізічных уласцівасцях. Калі хто зацікавіцца гэтым пытаннем, можа дапамагчы. Прыходзьце ў музей на геаграфічны факультэт пазнаёміцца з уральскімі ізумрудамі (іх у нас больш за дзесяць), а таксама з іншымі разнавіднасцямі берылаў (аквамарынамі, геліядорамі...) і іх суседзямі ў вітрынах. Атрымаеце адказы на хвалюючыя пытанні і яшчэ адчуеце, як прыемна, калі ў мітуслівай будзённасці вам падміргне сапраўдны таямнічы крышталік вялікага Сусвету, такі дасканалы, дзівосны, і парадуе веснавой зялянінай.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00

6 МАЯ
Зак. 364.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі:
220080, Мінск-80,
Універсітэцкі гарадок,
вул. Бабруйская, 7,
паверх 4, пакой 411,
тэлефон 2206827.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча